# АРХИТЕКТУРА

**УДК 72.05:296.735(476.6)**

## СТРАЧАНАЯ СПАДЧЫНА АСТРАВЕЧЧЫНЫ

***М.К. ШАЎЛІС***
***(Прадстаўлена: І.У. ВАТКІНС)***

*Архітэктура ёсць звонку бачнае адлюстраванне стану грамадства, паколькі найбольш хутка і глыбінна рэагуе на змены яго сацыяльна-эканамічнай структуры. Архітэктура сядзібы Астравеччыны, як і архітэктура сядзіб увогуле, дае магчымасць акунуцца ў паўсядзеннае жыццё іх уладальнікаў і насельніцтва.*

Большая колькасць сядзіб на Астравеччыне не захаваася, але дзякуючы гістарычным пісьмовым крыніцам, фотаздымкам перад намі паўстаюць прыгожыя палацы, сядзібы, маёнткі.

Адной са старэйшых на Астравеччыне была сядзіба Лазоўка (Лознікі), паводле інвентара за 1586 год. Яна размяшчалася каля ракі Лазоўка з рыбным ставам побач з віленскім трактам і займала плошчу 2,84 га. Вылучалася заможнасцю і выразнай планіровачнай арганізацыяй прасторы. Уключала: двор, да якога вяла грэбля; абору; гумнішча; агарод і яблыневы сад, агароджаныя плятнём; лазню; саладоўню і бровар каля сажалкі. Двор забудаваны па перыметры, абкружаны агароджай з 58 праслаў з 2 брамамі, меў 3 жылыя дамы, 2 стайні, 6 свірнаў з ганкамі, клець і склеп. Новы сядзібны дом, крыты дранкай, быў трохкамерным, меў 2 святліцы праз сені, грыдню і каморы. Абора з трыма пунямі, а таксама гумнішча з’яўляліся самастойнымі гаспадарчымі комплексамі. Гумнішча вылучалася вялікімі намерамі, мела агароджу з 36 праслаў агульнай даўжынёй больш за 320 м. Уключала 2 стадолы з токам пасярэдзіне, асець з печкай для сушкі снапоў, 2 адрыны для сена, азярод, адкрыты ток. Каля тракта стаяла дваровая карчма, пад адным дахам з якой размяшчаліся стайня з варотамі, чорная ізба і камора. Сядзіба Лазоўка па планіроўцы і наборы збудаванняў мела характэрныя рысы рэнесансных сядзіб Беларусі другой паловы XVI стагоддзя.

Гістарычныя крыніцы сведчаць аб бым, што ў гэты час існавалі сядзібы ў Варнянах, Трокеніках, Астраўцы і, відаць, у многіх іншых мясцінах раёна. Сядзіба ў Астраўцы пачатку XVII стагоддзя з’яўлялася радавым гняздом роду Беліковічаў [1]. Размяшчалася паміж мястэчкам Астравец і аднайменным сялом. Паводле інвентара за 1634 год таксама мела двор і гумнішча, гаспадарчы двор, бровар, ставы. Вылучалася больш высокім узроўнем і якасцю забудоў. Сядзібны дом з ганкам меў 4 ізбы, жылую і 2 гаспадарчыя, каморы, камору-спіжарню і вялікія сені. У доме былі кафляныя печы, прыбіральня. Вокны стайні былі шкляныя. Каля става, акрамя бровара, на які вада падавалася па спецыяльным трубаправодзе, працаваў млын. У 1612 годзе згодна тэстаменту ўладара маёнтка Андрэя Сасіновіча Беліковіча, суддзі земскага ашмянскага, маёнтак з дваром адышоў яго жонцы Крысціне з Катоўскіх. У 1614 годзе адпаведна яе тэстаменту ўладанне перайшло малалетнім унукам (Стафану, Крыштофу, Ерамею), сынам Адама, старэйшага сына. Адам, суддзя земскі, і яго жонка рана памерлі, таму дзеці, адпаведна тэстаменту, атрымалі апякунства. Акрамя таго, ім завяшчалася «... золата, серебро, ... медь і все, што в реестре моем напісано ... меть в схованью в іменью Островецкомъ».

Абедзьве сядзібы не захаваліся [2, ст. 489].

Ад былога прыгожага палаца Турлы захаваліся толькі руіны. Сядзіба Турлы належала Бжастоўскім і Котвічам. У другой палове XVIII стагоддзя маёнтак належаў Міхаілу, праўнуку Цыпрыяна Паўла Бжастоўскага, генерал-лейтэнанту пяхоты Вялікага Княства Літоўскага, пісару ВКЛ, канюшаму ВКЛ, падскарбію ВКЛ. Ад яго перайшоў Ксаверыю Котвічу, прадстаўніку старажытнага польскага роду, адна з галін якога асела ў ВКЛ.

Ад Ксаверыя вялікі маёнтак (каля 5000 га) з фальваркамі Палесціна, Чэхія, Лабудзі, Міхалішкі, Язаў адышоў сыну Яну, потым Ксаверыю, сыну апошняга. Наступным уладальнікам быў сын Ксаверыя і Ізабэлы з Волкаў Ян Котвіч. Ад яго Турлы адышлі сыну Юзафу.

У пачатку XIX стагоддзя. Ян Котвіч заклаў новы двор з паркам на плошчы 20 га ў стылі класіцызму. Цэнтрам кампазіцыі стаў палац (мал. 1), прамавугольны ў плане, мураваны, аднапавярховы з двухпавярховай цэнтральнай часткай. Бляха невысокага даху з люкарнамі была пафарбавана ў чырвоны колер. Цэнтральная частка параднага фасада вылучана чатырохкалонным тасканскім порцікам і мела бал-

кон над уваходам. На тыльным фасадзе замест балкона была мураваная тэраса з бакавымі прыступкамі, якія вялі ў парк.

Палац уключаў вестыбюль, бібліятэку, салон, сталовую, кабінет, будуар, буфет, жылыя і рознага іншага прызначэння пакоі, інтэр'еры якіх былі багата абстаўлены. З правага боку да вестыбюля прымыкала бібліятэка. Кнігазбор Котвічаў складаўся з кніг на польскай, лацінскай, французскай і нямецкай мовах, старажытных выданняў. Зашклёныя шафы з дубу стаялі ўздоўж сцен пакоя. Ахвяраваны гаспадарамі Віленскаму таварыству сяброў навукі кнігазбор быў страчаны ў гады Першай сусветнай вайны. Найбольш рэпрэзентатыўным лічыўся салон – вялікі квадратны ў плане пакой, аклееены белымі з залатым лісцем шпалерамі. Столь, з якой звісала хрустальная люстра, была ўпрыгожана багатай ляпнінай, узорны светлага колеру паркет меў геаметрычны малюнак.

Пакоі мелі прыгожыя кафельныя печы, каміны. У салоне знаходзіўся белы камін, які быў дэкарыраваны фрызам з раслiннымі матывамі, разеткамі і вазай, з якой звісалі гірлянды.



Мал. 1. Сядзібны дом у вёсцы Турлы. Парадны фасад

Мэбля была зроблена з каштоўных парод дрэва. У салоне віселі люстры ў пазалочаных рамах, стаяла фартэпэяна, мелася калекцыя карцін замежных мастакоў, а таксама Яна Рустэма, Францішка Смуглевіча і іншых.

Страчаны высечаныя з валуноў незвычайныя скульптуры, якія былі расстаўлены Янам Котвічам вакол палаца.

Часткова прасочваецца былы парадны партэр з традыцыйным кругам дыяметрам каля 80 м, да якога вядзе ўязная алея. Па перыметры круг з кветкавымі рабаткамі быў абсаджаны ліпамі з фармаванымі ў выглядзе шара кронамі. Захавалася 31 дрэва.

За палацам размяшчаўся пейзажны парк з выразнай кампазіцыйнай воссю. Яна ішла ад палаца цераз дамбу паміж дзвюма сажалкамі, далей – уздоўж алеі паміж садам і агародам, замыкалася лямусам. Гэта было двухпавярховае збудаванне з цэглы і палявога каменю, завершанае арыгінальным дахам у выглядзе кітайскай пагады. Мела 3 ізбы і вялікую залу на другім паверсе, які ўпрыгожвала драўляная галерэя. Служыла домам садоўніка і адначасова з'яўлялася рамантычным элементам парку. З гаспадарчых будынкаў, размешчаных з двух бакоў партэра і аддзеленых ад яго групамі дрэў, захавалася стайня (35×12 м). Будынак вылучаецца прыгожай кладкай сцен і франтонаў з валуноў з закладкай шчылін мураванымі асколкамі. Вуглы складзены шчыльна падагнанымі блокамі, высечанымі з валуноў. Вокны абкладзены чырвонай цэглай.

Часткова захавалася другая ўязная кляновая алея, якая называлася «палесцінскай». Яна вяла да фальварка Палесціна, дзе 3 гаспадарчыя будынкі, пабудаваныя на мяжы XIX–XX стагоддзяў, і адзінкавыя старыя дрэвы. Сярод будынкаў вылучаецца малочная (17×17 м), складзеная з буйнога колатага камення, падвальны паверх якой перакрыты паўцыркульнымі скляпеннямі.

Асобна трэба адзначыць сядзібу Блажэвічаў Дрэвянікі каля вёскі Задворнікі, якая вылучаецца кампактнасцю і прыгажосцю краявіду. Да 1926 года маёнтак належаў Юльяну Блажэвічу, доктару медыцыны (пахаваны на фамільных могілках каля сядзібы). Апошнімі ўладальнікамі былі Альбекі. Сядзіба закладзена на рубяжы XIX–XX стагоддзяў сярод поля, на маляўнічай узгорыстай мясцовасці. У плане мае форму амаль квадрата плошчай каля 4 га.

Парадны двор займае найбольш узвышаную сядзібную мясціну і дамінуе ў кампазіцыі. Сядзібны дом невялікі, драўляны і разам з газонам маляўніча ўпісаны ў акружэнне векавых магутных дрэў – дуба, клёна, ясеня, таполяў. З левага боку газона сярод кустоў бэзу, караганы, язміну стаіць драўляная афіцына. Далей, за старым вязам, які расце ў выглядзе куста з чатырох ствалоў, размешчана маленькая (4×3,5 м) лядоўня. Будынак складзены з буту, вуглы цагляныя, дах чатырохскатны.

Сядзібу перасякае ліпавая алея. Уезд фіксаваны дзвюма таполямі Пятроўскага. Алея вузкая (шырыня 3 м), мае ўзрост 150–200 гадоў і з'яўляецца, відавочна, бакавой алеяй баскета. Загінаючыся ў паўднёвую частку сядзібы, яна цягнулася ўздоўж саду і заканчвалася ў лясным масіве альтанкай (не захавалася). Другая альтанка, магчыма, каплічка, размяшчалася з правага боку ад уезду перад сажалкай. Сажалка ў глыбокіх берагах, з усіх бакоў абкружана дрэвамі. Другая сажалка, таксама крынічнага жыўлення, размешчана за домам, у плане квадратная, зарастае.

Невялікімі фрагментамі прадстаўлена сядзіба ў вёсцы Страча, сфарміраваная над аднайменнай ракой, у далёкім мінулым уладанне князёў Свірскіх. З 1616 года ўладальнікі маёнтка часта мяняліся. Імі былі Жаброўскія, з 1865 года – Пашкевічы. У пачатку XX стагоддзя Страча – вялікі маёнтак з фальваркамі, млынамі і броварам. У 1906 годзе распрадаецца. Сядзіба і 300 га зямлі адышлі Зыгмунту Хамінскаму [3]. Сядзібны дом, які захаваўся часткова і быў прыстасаваны пад капліцу св. Война, вядомы па фотаздымку 1910 года. Ён у плане прамавугольны, быў драўляны, аднапавярховы, з мезанінам і балконам, меў высокі ламаны дах і высокае сутарэнне з вокнамі. За домам быў парк з дзвюма сажалкамі, ад якога застаўся невялікі фрагмент дрэвастою. Сажалкі зарастаюць. Адпаведна сядзібнаму дому высокім дахам вылучаецца афіцына. Будынак абкладзены сілікатнай цэглай і добра прыстасаваны (дзіцячы садок, пачатковая школа).

Маляўнічасцю краявідаў вылучаецца *сядзіба Шайкуны* (называлася таксама Міхалічэва), размешчаная сярод палеткаў на значным аддаленні ад вёскі Клюшчаны, дзе была сядзіба Шырынаў. Двор у Шайкунах вядомы з XVII стагоддзя. Верагодна, што ён належаў уладальнікам Клюшчан – Корсакам, а затым – Шырынам. Ян Корсак фундаваў будаўніцтва ў Клюшчанах касцёла св. Яўхіма, філіял якога быў у Шайкунах. У 1840 годзе маёнткам валодаў суддзя Ігнацій з роду Сволкеня, які паходзіў са Швецыі. Ён атрымаў маёнтак з 6000 дзесяцінамі зямлі ў якасці пасагу жонкі Міхаліны з Даўгялаў-Кучэўскіх. У 1879 годзе ўладанне адышло сыну Эдварду, а ў 1905 годзе – сыну апошняга, Канстанціну.

У двары з канца XVII стагоддзя да 1928 года стаяў сядзібны дом (мал. 2), зрублены з лістоўніцы ў стылі, які спалучаў элементы рэнесансу і барока. Вядомы па фотаздымках 1900-х гадоў. Ад яго, пасля пажару 1928 года, захаваліся толькі падмуркі і сутарэнні. Дом размяшчаўся ў глыбіні сядзібы, сярод парку, на беразе сажалкі. З тых часоў захавалася адно дрэва ліпы, што расло каля бакавога фасада.



Мал. 2. Сядзібны дом у вёсцы Шайкуны. Парадны фасад

Дом быў прамавугольны ў плане, з мезанінам і ганкам. Фасад вылучаны трыма шырокімі аркадамі, на якіх на ўзроўні другога паверха размяшчаўся драўляны балкон. З тыльнага боку палац меў тэрасу і таксама балкон з дрэва. Палац накрываў высокі чатырохсхільны дах з люкарнамі. У канцы XIX стагоддзя Эдвардам была праведзена рэканструкцыя і пашырэнне палаца. Да правага боку прыбудавана аранжарэя, якая служыла зімовым садам, да левага – кухня з буфетам. Дом уключаў сталовую, кабінет, 2 салоны, гасціныя, жылыя і іншыя пакоі. У пакоях было сабрана многа фамільных каштоўнасцей: старадаўняя і сучасная мэбля, персідскія дываны, фартэп'яна, фамільныя партрэты, бронзавыя і сярэбраныя кандэлябры на

мармуровых пастаментах, хрусталь, фарфор, збор гравюр на біблейскія тэмы, мастацкія палотны і інш. У шафах мелася каля 3000 тамоў кніг, сярод якіх былі выданні XVI–XVII стагоддзяў, рукапісы на пергаменце. Частка кнігазбору была перададзена ў публічныя зборы Вільні.

Стары парк у канцы XIX стагоддзя быў перапланаваны. Новая планіроўка ў пейзажных формах наклалася на старую рэгулярную. У аснову кампазіцыі парку пакладзены 3 алеі, якія разыходзяцца ў розныя бакі з аднаго месца. Першая ясеневая алея праходзіць паміж двума параўнальна вялікімі, паўнаводнымі каналамі былой воднай сістэмы. Старыя дрэвы амаль усе страчаны, ад пнёў пайшлі парасткавыя ствалы. Другая алея з елкі звычайнай ідзе ўздоўж поля, яна абвалавана, магутныя карані дрэў ахапілі і замацавалі вал. Елкі добра захаваліся, нясуць сляды былой фармоўкі. Трэцяя ясянёвая алея ідзе праз тавалгавую лугавіну і выводзіць на ўзгорак з вадаёмам каля падножжа, на якім, відаць, была альтанка, аб чым сведчаць вялікія валуны ўздоўж алеі. Вадаёмы парку злучаліся пратокамі, праз якія былі перакінуты мосцікі. Захаваўся адзін з іх, аднаарачны з палявога каменя.

Перад палацам з левага боку стаяў спіхлер, равеснік палаца, а з супрацьлеглага – драўляная афіцына з двума ганкамі на дзвюх калонах кожны. Пад’язны круг страчаны. Яго месца абступаюць старыя вязы, ліпы, клёны і ясені. Да круга, з боку вёскі, вядзе ўязная ліпавая алея. Яна доўгая, пятляючы, перасякае ўзгоркі, агінае парк, паўтараючы формы рэльефу. Ад алеі захавалася няшмат дрэў. Яны вялізныя, з маляўнічымі кронамі.

Парадная частка сядзібы павернута ў бок капліцы, пабудаванай у 1840 годзе Ігнаціем Сволкенем сярод ляснога масіву. Тэрыторыя навокал яе добра спланавана і абвалавана.

Акрамя ліпавай, была яшчэ другая таполевая ўязная алея, якая ад сядзібы была арыентавана да касцёла Маці Божай у Клюшчанах. Алея даўжынёй больш за кіламетр, шырынёй 7 м, дрэвы пасаджаны праз 11 м. Яна даўно не выкарыстоўваецца па назначэнні, таму зарасла хмызнякамі, падростам дрэў і травой.

У парку, акрамя мясцовых відаў дрэў, мелася шмат іншаземных, экзатычных. Захаваліся рабіннік, пузыраплоднік, карагана, бэз, спірэя, снежна-ягаднік, адзінае дрэва арэха шэрага.

Часткова, у выглядзе асобных фрагментаў, захаваліся невялікія эклектычныя сядзібы ў Задворніках, Налянах, Карвэлях, Падольцах, Каменцы, Альгінянах, Вандацішках, Вароне [4, ст. 495].

Пра сядзібу Крукоўскіх у Падольцах, у якой у 1864 годзе налічвалася 57 рэвізскіх душ, нагадвае частка ўязной ліпавай алеі (узрост дрэў 150 гадоў), фрагмент пейзажнага парку з прыгожай палянай, старымі ліпамі, клёнамі, таполямі, лістоўніцай еўрапейскай.

Сядзіба Брэйткаў у Палянах таксама займае маляўнічую ўзгорыстую мясцовасць. Часткова захаваліся пейзажны парк з садам (плошча каля 5 га), адна з уязных алей, сховішча садавіны і гародніны, доўгая нізкая забудова з мураваным скляпеннем. Парк складаюць невялікія драўняныя масівы з клена, бярозы, ясеня, якія чаргуюцца з лугавінамі.

Ад сядзібы Малі, што належала Гашкевічам, захаваліся толькі рэшткі дзвюх ліпавых алей і адзінкавыя дрэвы. Тут з 1865 года жыў з сям’ёй І.А. Гашкевіч, вядомы дыпламат, вучоны-мовазнавец, даследчык Японіі і Кітая, які, акрамя таго, займаўся пытаннямі астраноміі, метэаралогіі, калекцыяніраваў насякомых.

Да стварэння на Астравеччыне выдатных помнікаў дойлідства – храмаў і палацаў – далучыліся са старажытнасці вялікія князі Вялікага Княства Літоўскага, віленскае біскупства, пазней – буйныя мясцовыя магнацкія і шляхецкія роды Бжастоўскіх, Абрамовічаў, Котвічаў і іншыя. На жаль, разам з імі адышлі ў нябыт і многія набыткі культуры Астравеччыны, асабліва ў XX стагоддзі, адзначаным шматлікімі і складанымі ваеннымі і палітычнымі падзеямі.

## ЛІТАРАТУРА

1. Нальшчан, Т. Гісторыя вёсак і мястэчак Астравеччыны – Астравец [Электронны рэсурс] / Т. Нальшчан. – Рэжым доступу: http://astraviec.org/cms/index.php?option=com_content&task=view&id= 85&Itemid=38. – Дата доступу: 09.09.2015.
2. Памяць. Астравецкі раён. – Мінск: Беларус. Энцыкл., 2004. – 489 с.
3. Нальшчан, Т. Гісторыя вёсак і мястэчак Астравеччыны – Страча [Электронны рэсурс] / Т. Нальшчан. – Рэжым доступу: http://astraviec.org/cms/index.php?option=com_content&task=view&id=324&Itemid=38. – Дата доступу: 14.09.2015.
4. Памяць. Астравецкі раён. – Мінск: Беларус. Энцыкл., 2004. – 495 с.